ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 14 (915) | Аўторак, 22 кастрычніка 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

### ПАМЯЦІ ВЫДАТНАГА ВУЧОНАГА

*Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны педуніверсітэт імя М.Танка, Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны, Беларускае педагагічнае таварыства праводзяць 26-29 кастрычніка г.г. Міжнародны кангрэс "Л.С.Выгоцкі і сучаснасць", прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага вучонага, нашага земляка.*

*Напачатку кангрэс будзе праходзіць на базе Беларускага дзяржпедуніверсітэта імя М.Танка. 27-га кастрычніка яго ўдзельнікі пераедуць у Гомель -- на радзіму юбіляра. На працягу двух дзён у сценах нашага універсітэта кангрэс прадоўжыць сваю работу.*

## З ІМКНЕННЕМ ДА ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Учора пачаліся заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні стацыянарнага набору. Слухачы набіраліся на ўсе спецыяльнасці нашага універсітэта. На планавыя 75 месц прэтэндавала 350 чалавек. Сярод іх былі медалісты сярэдніх школ, выпускнікі з высокімі баламі ў атэстатах сталасці. Найвышэйшы конкурс утварыўся на спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт", "Правазнаўства", "Беларуская мова і літаратура" і інш. Словам, за кожнае месца сапернічала ў сярэднім амаль па пяць чалавек. Слухачамі падрыхтоўчага аддзялення стала 140 юнакоў і дзяўчат. Многія з іх (з існуючымі цяпер умовамі) прыняты на вучобу за поўную аплату навучання.

## НА ПЛЕНУМЕ ВЕТЭРАНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

У канцы першай дэкады кастрычніка адбыўся пленум гарадской ветэранскай арганізацыі. Абмеркавана пытанне аб паляпшэнні выхаваўчай работы з моладдзю.

У рабоце пленума прынялі ўдзел прадстаўнікі мясцовых улад, сярэдніх школ, навучальных устаноў, ад нашага універсітэта -- Герой Сацыялістычнай Працы прафесар М.А.Дзмітрыеў, палкоўнік у адстаўцы, старшыня універсітэцкай ветэранскай арганізацыі А.А.Косцікаў і прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце дацэнт М.М.Воінаў, які выступіў пры абмеркаванні пастаўленага на парадак дня пытання.

## АДБУДЗЕЦЦА АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ

Упершыню 8 лістапада бягучага года ў 10 гадзін у галоўным корпусе універсітэта (пакой 2-24) на пасяджэнні сёлета створанага Савета К.02.12.03 адбудзецца абарона дысертацыі малодшага навуковага супрацоўніка лінгвістычнай лабараторыі ГДУ С.М.Струкавай "Пераемнасць і эвалюцыя лексічных традыцый у беларускай мове" на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці "Беларуская мова".

Навуковы кіраўнік -- доктар філалагічных навук, прафесар У.В.Анічэнка.

Афіцыйныя апаненты: член-карэспандэнт АН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар А.М.Булыка і кандыдат філалагічных навук, дацэнт Мазырскага педінстытута У.Ц.Піскун.

## ЗА ВУЧОНЫЯ СТУПЕНІ І ЗВАННІ ЎСТАНОЎЛЕНА ДАПЛАТА

**У мэтах павышэння прэстыжу і эфектыўнасці інтэлектуальна-творчай працы, умацавання навуковага патэнцыялу рэспублікі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў указ, у адпаведнасці з якім з 1 студзеня 1997 года ўстаноўлены памеры штомесячных даплат за вучоныя званні і ступені.**

Акадэмікі, члены-карэспандэнты Акадэміі навук Беларусі, Акадэміі аграрных навук, асноўным месцам работы якіх з'яўляюцца ўстановы і арганізацыі навукі, адукацыі, культуры, аховы здароўя, а таксама пенсіянеры, якія маюць гэтыя званні, будуць атрымліваць адпаведна дзесяць і сем мінімальных заработных плат. Дактарам і кандыдатам навук -- работнікам арганізацый і ўстаноў, што фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту, прадугледжаны адпаведна шэсць і тры мінімальныя заработныя платы.

Кіраўнік дзяржавы даручыў Кабінету Міністраў прадугледзець у праекце рэспубліканскага бюджэту на 1997 год сродкі на павелічэнне памераў даплат за вучоныя званні і ступені.

БЕЛТА.

## ЗААХВОЧВАЮЦЦА ЗДОЛЬНЫЯ

У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5-га верасня 1996 г. N262 зацверджана палажэнне аб парадку заахвочвання вучоных і выкладчыкаў, якія ўносяць асабісты ўклад у фарміраванне новай, больш эфектыўнай сістэмы адукацыі, распрацоўку сучасных методык развіцця здольнасцей таленавітай моладзі ў галіне навукі, тэхнікі і перадавых тэхналогій.

Устаноўлены заахвочванні з уручэннем Пасведчанняў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў: гранд-прэмія -- 20 мінімальных заработных плат, I-я прэмія -- 15, II -- 10, III-я -- 7 мінімальных заработных плат.

Рашэнне аб заахвочванні кандыдатаў будзе прынята Саветам Спецыяльнага фонду ў чацвёртым квартале бягучага года.

Указаным распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацверджана і палажэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і навучэнцам, якія дабіліся высокіх паказчыкаў у вучобе. Мінімальная дапамога ўстаноўлена ў памеры не ніжэй трох мінімальных заработных плат.

Рашэнне аб заахвочванні кандыдатаў будзе прынята Саветам Спецыяльнага фонду ў чацвёртым квартале бягучага года.

Указаным распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацверджана і палажэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і навучэнцам, якія дабіліся высокіх паказчыкаў у вучобе. Мінімальная дапамога ўстаноўлена ў памеры не ніжэй трох мінімальных заработных плат. Студэнты і навучэнцы, якія дабіліся высокіх паказчыкаў у вучобе, могуць адначасова атрымоўваць як грашовыя прэміі, так і іншыя віды заахвочванняў.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# АБАРОНЦА, ХІРУРГ, ПЕДАГОГ

(да 75-годдзя з дня нараджэння і 45-годдзя навукова-педагагічнай дзейнасці)

Прафесія медыка, бадай, самая высакародная. У гэтым даўно і добра пераканаўся Аляксей Савельевіч Калугін.

... На світанні 22 чэрвеня 1941 года ў ліку першых на абарону Радзімы сталі пагранічнікі. Больш 11 сутак пагранічнікі 12-й заставы 25-га пагранатрада абаранялі нашу граніцу ад захопнікаў. Тут атрымаў сваё баявое хрышчэнне санітарны інструктар Аляксей Калугін.

А наперадзе былі доўгія франтавыя дарогі. І заўсёды санінструктар Калугін быў у гушчыні баявых падзей. Свой баявы шлях ён закончыў у майскія дні 1945 года ў аўстрыйскім горадзе Юдзінбурзе. За мужнасць і гераізм А.С.Калугін узнагароджаны баявымі ордэнамі "Чырвонай Зоркі", "Айчыннай вайны II ступені", "Славы" (трэцяй ступені), медалём "За адвагу" і многімі іншымі медалямі.



Пасля дэмабілізацыі ў 1947 г. А.С.Калугін паступіў у Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, які закончыў з адзнакай.

Сваёй будучай прафесіяй ён выбраў самую цяжкую і высакародную -- хірургію. У 1962 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, а праз пэўны час -- доктарскую ў УНІ эксперыментальнай і клінічнай хірургіі ў Маскве. Ім былі распрацаваны і ўкаранёны ў клінічную практыку тры варыянты аперацый пры спаечнай хваробе брушыны, якія па сваёй мадыфікацыі з"яўляюцца больш фізіялагічнымі, чым аперацыі амерыканскіх хірургаў.

У 1971 г. А.С.Калугін прайшоў па конкурсу ў ГДУ на загадванне кафедрай фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны. Па яго ініцыятыве тут былі распрацаваны і ўкаранёны ў вучэбны працэс спецкурсы і спецсемінары па ўзроставай фізіялогіі, анатоміі чалавека, спартыўнай медыцыне. Па пастаноўцы навукова-даследчай работы кафедра неаднаразова займала ва універсітэце прызавыя месцы.

Аляксей Савельевіч вядзе ва універсітэце вялікую грамадскую работу: доўгі час быў навуковым кіраўніком студэнцкай моладзі, членам Каардынацыйнага Савета АН БССР і навукова-метадычнага Савета спорткамітэта рэспублікі, членам некалькіх навуковых таварыстваў Беларусі.

Пяру прафесара А.С.Калугіна належыць 150 навуковых работ у галіне клінічнай і спартыўнай медыцыны, фізіялогіі, у тым ліку 3 манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, метадычныя ўказанні. Ён узнагароджаны многімі граматамі, у тым ліку і Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Скарынаўскіх чытанняў 1996 года.

***Новых вам поспехаў і моцнага здароўя на многія гады, Аляксей Савельевіч!***

**Т.ГІЛЕП, ст.выкладчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін.**

**Думкі юрыста перад рэферэндумам**

# ЧЫНОЎНІК ДЛЯ ПРАВІНЦЫІ

У сістэме органаў улады найбольш слабым звяном, якое не адпавядае свайму прызначэнню, у нас заўсёды былі і цяпер застаюцца мясцовыя Саветы. Яны ў сваёй пераважнай большасці не здольныя праводзіць глыбокія рэформы ў розных сферах жыцця. На іх сесіях шмат гавораць, абмяркоўваюць, спрачаюцца, прымаюць пастановы, якія часцей за ўсё застаюцца на паперы.

Адна з галоўных прычын слабай дзеяздольнасці мясцовых Саветаў -- некампетэнтнасць, прафесійная непадрыхтаванасць кіруючых кадраў, адсутнасць выразных і абгрунтаваных крытэрыяў ацэнкі іх працы. Таму не дзіўна, што насельніцтва ў асноўнай сваёй масе не давярае кіраўнікам на месцах. Відавочна, рэфармуючы мясцовую ўладу, сёння яе праца павінна ацэньвацца па прынцыпова іншых крытэрыях, якія прымусілі б работнікаў дзяржаўнага апарату павярнуцца тварам да насельніцтва, яго клопатаў і патрэбаў. У аснову іх неабходна пакласці прыярытэт чалавека, прызнанне яго не на словах, а на справе вышэйшай каштоўнасцю і галоўным багаццем грамадства. Праўда, тут узнікаюць пытанні. Што лічыць дабром для чалавека? Якая тут іерархія каштоўнасцей? Чаму аддаць безумоўную перавагу?

Адказаць на іх не так проста, як можа паказацца на першы погляд. Шмат чаго з таго, што ўчора здавалася натуральным, успрымалася адназначна як прагрэс, нібыта служыла цяперашняму і будучаму пакаленням, сёння павярочваецца ядзернымі і экалагічнымі катастрофамі, пагражае здароўю і жыццю людзей, ставіць пад пытанне фізічнае выжыванне нацыі. Не сакрэт, што ўзровень смяротнасці на 1000 чалавек цяпер у большасці рэгіёнаў рэспублікі перавышае нараджальнасць. У нашым грамадстве ўсяго восем працэнтаў здаровых людзей. Для нармальнага ж яго развіцця гэта лічба не павінна апускацца ніжэй 60 працэнтаў.

Таму крытэрый ацэнкі працы кадраў мясцовага кіравання і самакіравання павінен абапірацца на аб'ектыўныя, дэідэалагізаваныя, а адсюль -- і параўнальныя паказчыкі, быць зразумелым і блізкім кожнаму разумнаму чалавеку, мець чалавечае вымярэнне. На мой погляд, усім гэтым патрабаванням максімальна адпавядаюць лічбы захворванняў людзей і сярэдняй працягласці іх жыцця, суадносіны нараджальнасці і смяротнасці. Відавочна, менавіта ў іх знаходзяць канцэнтраванае выяўленне і ступень гуманізацыі грамадскіх адносін, і ўзровень развіцця культуры, прадукцыйных сіл, і накіраванасць іх выкарыстання, маральнае і фізічнае здароўе насельніцтва, і ўмовы яго працы і быту.

Каб мясцовае кіраўніцтва і самакіраванне пачало працаваць у прынцыпова новым рэжыме, для гэтага недастаткова толькі ўвядзення прэзідэнцкай "вертыкалі" выканаўчай улады і пераразмеркавання функцый паміж прадстаўнічымі і выканаўчымі органамі на месцах. Эфектыўнасць гэтых органаў залежыць не толькі, а можа, і не столькі ад арганізацыйных фактараў, колькі ад якасці самога персаналу. Толькі арганізацыйнымі пераўтварэннямі кадравых праблем не вырашыць. Сёння большасць пасад у органах мясцовай улады і кіраўніцтва займаюць вузкія спецыялісты -- тэхнолагі вытворчасці. У іх дзейнасці пераважае тэхнакратычны стыль, яны слаба бачаць узаемасувязь эканамічных, палітычных і духоўна-мараль-

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 5 стар.)



Інтэрв'ю

# ФЕСТЫВАЛЬНАЕ ЛЕТА "РАДЗІМІЧАЎ"



**Сапраўдны творчы калектыў ніколі не заспакойваецца на дасягнутым, а імкнецца да далейшага ўдасканалення свайго майстэрства. І ў пошуку новых форм знаёмства гледача са сваім мастацтвам адшліфоўваецца яго талент, што, безумоўна, аднолькава каштоўна як для саміх удзельнікаў, так і глядзельнай залы, якая бачыць плённы вынік -- мастацтва, якое па-сапраўднаму ўражвае. Адзін з такіх калектываў -- народны фальклорна-харэаграфічны ансамбль ГДУ імя Ф.Скарыны "Радзімічы". Сёлетняе лета прынесла яму славу і прызнанне далёка ад Беларусі -- аж на чатырох міжнародных творчых фестывалях, якія праходзілі ў Даніі, Францыі, Вялікабрытаніі і Італіі.**

***-- Аляксандр Віталье віч, -- пытаюся ў мастацкага кіраўніка "Радзімічаў" і дырэктара культурнага цэнтра універсітэта А.Лысянкова, -- як вы трапілі ў такое вялікае замежнае турнэ?***

-- Тут трэба зрабіць невялікі экскурс у часе і нагадаць аб тым, што ў 1994 г. у нашым універсітэце па ініцыятыве культурнага цэнтра праходзіў I Міжнародны фестываль "Арт-сесія", які сабраў у Гомелі маладзёжныя калектывы многіх краін. Наша знаёмства з іх творчасцю, а замежных гасцей -- з нашым мастацтвам узбагацілі кожнага, і проста шчырыя чалавечыя адносіны паміж моладдзю розных нацыянальнасцей далі магчымасць завязаць цёплыя сяброўскія сувязі, якія не парываюцца і сёння. Дзякуючы ім даведаліся, якія маладзёжныя фестывалі праводзяцца за мяжой. А мы, распачынаючы тады фестывальны рух у нас на Гомельшчыне, ставілі на мэце даказаць многім, што Гомель не павінен заставацца ў баку ад культурнага жыцця не толькі рэспублікі, але нават і Еўропы. Бо было крыўдна, што пасля чарнобыльскай трагедыі мы быццам апынуліся ў духоўным вакууме, у той час як гарады Віцебск і Маладзечна сталі набываць шырокую вядомасць, дзякуючы праводзімым у іх прэстыжным фестывалям. Запрашэнне намі на "Арт-сесію" шмат замежных гасцей, іх прыезд да нас у Гомель паклалі пачатак вялікай і важнай справе: еўрапейскім гасцям мы даказалі, што жыццё ў нас працягваецца, нягледзячы на пост-чарнобыльскія рэаліі, і наша мастацтва вартае таго, каб з ім знаёміліся прадстаўнікі далёкага замежжа. Затым, зноў жа дзякуючы асабістаму энтузіязму, наш універсітэт у другі раз здолеў сабраць шмат маладзёжных калектываў як з краін СНД, так і Еўропы на II фестываль "Арт-сесія-96". На гэты раз вялікую падтрымку аказалі нам Камітэт па справах моладзі Рэспублікі Беларусь, які дапамог з фінансаваннем фестывалю, міністэрствы культуры, адукацыі і навукі, па надзвычайных сітуацыях, чаго нельга сказаць аб мясцовых уладах. Другі фестываль па колькасці яго ўдзельнікаў наблізіўся, па словах нашых замежных гасцей, да еўрапейскага ўзроўню.

***-- Вось на гэтай карце Еўропы, што вісіць на сцяне ў вашым кабінеце, бачны нейкія цікавыя абазначэнні...***

-- На ёй я адзначыў, са слоў замежных гасцей, калі і ў якой краіне праводзяцца маладзёжныя творчыя фестывалі.

***-- І ўзнікла жаданне трапіць хоць на які-небудзь з іх і вам?***

-- А чаму б і не... Нашы замежныя госці паказвалі нам відыёзапісы выступленняў розных калектываў, а мы падзяліліся з імі сваімі. У нас склалася ўяўленне, калектывы якога ўзроўню запрашаюцца на еўрапейскія фестывалі. Адчулі, што зможам выглядаць на іх фоне ніколькі не горш. І гэта не самаўпэўненасць. Паездка "Радзімічаў" два гады назад у Францыю, выступленне з канцэртамі ў мясцовасці дэпартамента горада-пабраціма Клермон-Ферана паказала нам, што мастацтва беларускага танца, наш фальклор зацікавілі французскіх сяброў. Таму, можна сказаць, мы ўжо атрымалі ацэнку замежнай публікі і гэта надавала нам большую ўпэўненасць.

***-- Цяпер больш падрабязна раскажыце аб удзеле "Радзімічаў" у сёлетніх фестывалях.***

-- Атрымалася так, што за тры летнія месяцы і верасень яны праходзілі ў Даніі, Францыі, Вялікабрытаніі і Італіі. Мы трапілі на ўсе з іх. Практычна ўсё лета з невялікімі перапынкамі правялі ў замежжы. Заканчваўся, напрыклад, фестываль у Даніі, мы вярталіся назад, у Гомель, каб узяць у наступную паездку ў іншую краіну візы, і яшчэ некалькі ўдзельнікаў ансамбля ці наадварот, у меншым саставе паехаць на трэці па ліку фестываль.

Першы з іх праходзіў у Даніі. 200 маладзёжных творчых калектываў з 40 краін сабралася ў яе сталіцы -- Капенгагене. Наш ансамбль быў на ім адзіным прадстаўніком не толькі Беларусі, але і краін СНД такога напрамку. Мы вылучаліся на агульным фоне шматлікіх музычных калектываў самых розных стыляў і жанраў, таму да нас увага была асаблівая. У розных залах, на шматлікіх фестывальных пляцоўках горада мы далі восем канцэртаў. Выступілі з праграмай працягласцю паўтары гадзіны, у якую ўвайшлі харэаграфічныя кампазіцыі, у многім пабудаваныя на фальклоры выселеных пасля Чарнобыля вёсак Беларускага Палесся. Асабліва прываблівала гледачоў атрыбутыка нашых танцаў, маляўнічасць канцэртных касцюмаў. Яны змаглі ўбачыць крыніцы беларускай народнай творчасці і тое, як фальклор у нас ашчадна захоўваецца, хаця жыццё там, дзе ён нарадзіўся і бытаваў, пасля чарнобыльскай трагедыі ўжо спынілася.

Нам пашанцавала выступіць на самых прэстыжных і вялікіх канцэртных пляцоўках Капенгагена -- у славутым парку Цівалі, у грандыёзным па задуме Еўрапарку, дзе ўсё нагадвае часы старажытных вікінгаў. А яшчэ большы гонар быў аказаны нам у апошні дзень фестывалю -- мы ўдзельнічалі ў канцэртнай праграме ў час яго закрыцця, што праходзіла ў вялізнай па сваіх памерах зале "Форум".

На дацкай зямлі мы знайшлі шмат сяброў, а галоўнае -- наш калектыў быў уключаны ў Еўрапейскі рээстр-каталог маладзёжных творчых калектываў. Усе, хто туды ўваходзіць, атрымліваюць свой кодавы нумар, туды заносяцца ўсе зыходныя даныя аб калектыве. Дзякуючы гэтаму яго могуць запрасіць на любы маладзёжны фестываль Еўропы. Ёсць надзея, што ў будучым такія запрашэнні атрымаюць і "Радзімічы", бо ў Даніі намі ўжо зацікавіліся прадстаўнікі некаторых замежных краін.

Наступнай на нашым фестывальным маршруце была Францыя. Яна нам ужо знаёмая, нас ведаюць па ранейшых нашых выступленнях у г.Клермон-Феран. На гэты раз мы трапілі ў г. Ісуар, які таксама размешчаны ў дэпартаменце горада-пабраціма. Тут праводзіўся юбілейны фальклорны танцавальны фестываль. У ім прымалі ўдзел 26 ансамбляў, кожны з якіх быў цікавым па-свойму, яркім, адметным. Іспанія, Партугалія, Італія, Бразілія, Перу... Адзін толькі пералік краін можа сказаць, які тут быў багаты нацыянальны каларыт! Нам важна было не згубіцца сярод гэтага мноства калектываў, а наадварот звярнуць на сябе ўвагу. Гэта ўдалося. Нас заўважылі і адзначылі ў першы дзень фестывалю ў час параду ансамбляў, калі на вуліцах горада

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 4 стар.)

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 3-й стар.)

## ФЕСТЫВАЛЬНАЕ ЛЕТА "РАДЗІМІЧАЎ"

жыхары стаялі ўздоўж тратуараў і назіралі, як кожны калектыў, рухаючыся адзін ад аднаго на адлегласці 100 м, дэманстраваў свае нацыянальныя танцы. І потым ужо непасрэдна на саміх канцэртах гледачы не раз выклікалі нас на "біс", асабліва пасля нашага "Карагода". Адчувалася, што ім падабаюцца лірызм, пяшчота, мяккасць беларускага харэаграфічнага мастацтва, натуральнасць у мастацкім яго выражэнні. Шмат сюжэтаў нашых танцаў звязана з беларускім бытам, у іх мы выкарыстоўваем яго прадметы, і гэтая нагляднасць давала замежным гледачам шырокае ўяўленне аб беларускай харэаграфіі і культуры нашага народа наогул.

Многае на гэтым фестывалі ўзялі для сябе і мы, як выканаўцы. Мы глядзелі на выступленні калектываў з розных краін, рабілі параўнанні і прыйшлі да высновы: кожны народ, яго мастацтва цікавыя па-свойму, але ёсць ва ўсіх іх нямала агульнага.

Вельмі цёплай, сяброўскай была атмасфера самога фестывалю. А да нашых дзяўчат паўсюдна адносіліся з найбольшай павагай, як да самых прыгожых прадстаўніц славянскіх народаў. Цудоўнымі былі і ўмовы, якія стварылі арганізатары фестывалю для ўсіх дэлегацый. Мы жылі ў школе паліцыі (нешта падобнае на нашы ваенныя вучылішчы), на тэрыторыі якой было мноства самых розных месц для цікавага і карыснага адпачынку, цудоўны сад з ружамі і інш. Міжволі напрошвалася параўнанне з нашымі ваеннымі гарадкамі, не на карысць апошніх.

Медалі фестывалю, горада Клермон-Ферана і спецыяльны імянны прыз прывезлі мы ў Гомель на памяць аб гасціннай Францыі, а самае галоўнае -- найлепшыя ўражанні, якія саграваюць душу і дагэтуль. Хіба ж забудзеш, напрыклад, экскурсіі па Парыжу, па яго самых выдатных мясцінах?

***-- А наступнай краінай вашага падарожжа была...***

-- Вялікабрытанія. Мы адправіліся туды прама з Францыі, не вяртаючыся назад у Гомель. На працягу двух тыдняў у шатландскім горадзе Абердзіне мы былі актыўнымі ўдзельнікамі яшчэ больш прэстыжнага фестывалю, чым ранейшыя. На яго прыехалі не толькі маладзёжныя творчыя калектывы Еўропы, але і ЗША, Канады, Японіі і інш. Акрамя традыцыйнага, нацыянальнага мастацтва тут было шырока прадстаўлена і сучаснае. Выступалі цікавыя аркестры, балетныя групы, а нас найбольш зацікавіла канцэптуальная харэаграфія (яе паказалі такія краіны як ЗША і Партугалія).

Шчыра кажучы, мы не спадзяваліся, што зможам выклікаць у англійскіх гледачоў такую зацікаўленасць да беларускага танца, бо англічане ў нашым уяўленні -- народ вельмі стрыманы ў сваіх эмоцыях. Але з першага нашага канцэрта такая думка рэзка змянілася, і мы ўбачылі як загараліся цікавасцю іх вочы, і яны неаднаразова выклікалі нас на "біс". Давялося даваць нават дадатковыя канцэрты. Мы выступалі ў зале абердзінскага тэатра, які з'яўляецца нацыянальным гонарам Шатландыі, у мюзік-холе, у клубе бізнесменаў, вялікім гандлёвым цэнтры горада, на канцэртных пляцоўках іншых гарадоў краіны.

Выпадковай, але вельмі цёплай, сардэчнай была сустрэча з нашымі маракамі з г.Мурманска, карабель якіх знаходзіўся ў той час у порце Абердзіна. Яны запрасілі нас да сябе ў госці, і мы выступілі ў іх з канцэртам.

Абердзін -- прыгожы і цікавы горад, а яго універсітэт, які ў мінулым годзе адзначыў сваё 500-годдзе, уразіў нас яшчэ больш. Мы жылі на яго тэрыторыі і не пераставалі захапляцца тым, якія выдатныя ўмовы для вучобы і адпачынку створаны яго студэнтам. Да нас тут адносіліся пааслівому цёпла, як да прадстаўнікоў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, з якім вось ужо некалькі гадоў Абердзінскі універсітэт падтрымлівае цесныя сяброўскія сувязі.

Давялося нам пабываць і ў шатландскіх замках, дзе мы разам з гасціннымі гаспадарамі развучвалі іх нацыянальныя танцы, на прыёме ў самай багатай ледзі Абердзіна. Урачысты прыём быў і ў мэра горада, дзе нашаму калектыву ўручылі дыплом лаўрэата фестывалю і каштоўны прыз. Запамяталася і сустрэча з паэтэсай Верай Рыч, якая робіць пераклады з беларускай мовы на англійскую для лонданскай скарынаўскай бібліятэкі.

Як не шкада было, але надышоў час развітання з гэтай краінай.

***-- І вам давялося рэзка змяніць маршрут з поўначы на поўдзень?***

-- Так. Нас чакала Італія. Запрасіла "Радзімічаў" туды арганізацыя "Анпас", якая займаецца аздараўленнем беларускіх дзяцей з чарнобыльскай зоны на Адрыятыцы. У гарадах, дзе адпачываюць нашы хлопчыкі і дзяўчынкі, праводзяцца традыцыйныя святы, выступаць на якіх давялося і нам. На працягу трох тыдняў мы аб'ехалі нямала такіх гарадкоў, давалі канцэрты, на якія з'язджаліся гледачы і з суседніх мясцовасцей. Італьянцы -- народ добразычлівы, гасцінны, і гэта мы вельмі добра на сабе адчулі.

***-- Такія паездкі, канешне ж, патрабуюць значных фінансавых расходаў...***

-- Так, за ўдзел у некаторых з гэтых фестываляў трэба было заплаціць нямала грошай. Нам дапамагалі спонсары і мы выкарысталі сродкі калектыву, якія мелі магчымасць зарабіць сваёй працай, а універсітэт, прафком студэнтаў па меры магчымасці падтрымалі студэнтаў, якія не маглі за сваю стыпендыю аформіць візы. Гарады-пабрацімы Клермон-Феран і Абердзін прымалі нас за свае грошы.

***-- Не кожнаму выпадае такі шчаслівы шанс, як вашаму ансамблю. Вам могуць пазайздросціць іншыя творчыя калектывы універсітэта. Што б вы маглі ім пажадаць?***

-- Працаваць і яшчэ раз працаваць. І вынік будзе. Культурны цэнтр ГДУ заяўляе розныя нашы калектывы на фестывалі, а выбар ужо застаецца за іх арганізатарамі.

**Гутарку вяла Т.ДУБЯК.**



***На здымку:* выступленне "Радзімічаў" на фестывалі ў Даніі.**



**Да ўвагі студэнтаў**

## Захоўваць правілы ўнутранага распарадку

-- Студэнты абавязаны беражліва адносіцца да дзяржаўнай і прыватнай уласнасці. За псаванне або знішчэнне маёмасці нясуць матэрыяльную адказнасць у размеры прычыненага па іх віне ўрону згодна дзейнічаючага заканадаўства.

-- За парушэнне абавязкаў, правілаў унутранага распарадку да студэнтаў, аспірантаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення можа прымяняцца адно з наступных спагнанняў:

а) *заўвага;*
б) *вымова;*
в) *строгая вымова;*
г) *выключэнне з універсітэта.*

-- Ва ўсіх вучэбных карпусах і інтэрнатах забараняецца курэнне.

**З унутранага распарадку, узгодненага з прафсаюзным камітэтам і зацверджанага Саветам універсітэта 4 студзеня 1990 г.)**

## АШЧАДНАСЦЬ І КУЛЬТУРА -- ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

Мы жывём у складаных крызісных умовах. Фінансаванне нашага універсітэта, як і іншых навучальных устаноў краіны, крайне абмежаванае. Сродкаў хапае на выплату заработнай платы, стыпендый і на іншыя самыя неабходныя патрэбы. У такіх абставінах трэба быць выключна беражлівымі, эканоміць кожны рубель усюды і ва ўсім.

Але ці так атрымоўваецца ў рэальнасці? Адназначна адкажам: не. Мы яшчэ не навучыліся разумна эксплуатаваць дзяржаўную, ды і ўласную, маёмасць. Ад рук зламыснікаў наносіцца вялікі ўрон. Аб гэтым сведчаць факты, якія мелі месца ў кожным вучэбным корпусе і інтэрнаце ГДУ. З парушэннямі ўнутранага распарадку кожны з нас сустракаецца даволі часта.

Як не шкада, але стала хранічным псаванне, а то і крадзёж дзяржаўнай маёмасці. У прыватнасці, па звестках галоўнага механіка універсітэта А.М.Алісіевіч, да пачатку бягучага навучальнага года былі адрамантаваны санвузлы вучэбных карпусоў з заменай няспраўных і разукамплектаваных сантэхматэрыялаў, абсталявання. Выкананы многія іншыя работы, на якія зрасходаваны значныя сродкі. І нярэдка марна. Толькі ў гэтым навучальным годзе без уліку працоўных затрат кошт сапсаванай і ўкрадзенай універсітэцкай маёмасці склаў амаль 3 млн. 700 тыс. рублёў.

Нельга перадаць словамі, як псуецца універсітэцкая мэбля, асабліва аўдыторныя сталы. Глядзіце, які "шэдэўр" выяўлены ў адной з аўдыторый 4-га паверха фізічнага факультэта, зафіксаваны фотакарэспандэнтам У.Чысцікам. Няўжо гэта стала звычным або незаўважным для кіраўніцтва факультэта і выкладчыкаў? Відавочна, так.

На жаль, падобнае можна ўбачыць і ў іншых аўдыторыях іншых факультэтаў. Як не сорамна, але маўчаць пра гэта больш нельга. Трэба павесці рашучую барацьбу за сапраўдную ашчаднасць, эканомію ў нашым універсітэце, навядзенне высокай санітарыі і культуры ў кожным вучэбных корпусе і інтэрнаце.



## АДДЗЕЛ ЗМЯНІЎ НАЗВУ

Загадам рэктара ГДУ ад 30.08.96г. структурнае падраздзяленне універсітэта "Аддзел па рабоце ў інтэрнатах" перайменаваны ў "Аддзел выхаваўчай работы з моладдзю". Ён знаходзіцца ў галоўным корпусе, п.І-16, тэл. 56-57-73.

## ЖАДАЕЦЕ ПАСЯЛІЦЦА Ў ІНТЭРНАЦЕ? КАЛІ ЛАСКА!

Прыгадваюцца першыя дні верасня бягучага навучальнага года. Тады ў галоўным корпусе універсітэта, каля дзвярэй аддзела па рабоце ў інтэрнатах былі вялікія натоўпы студэнтаў старэйшых курсаў і першакурснікаў. У іх было адно вялікае жаданне -- атрымаць месца ў інтэрнаце, каб не жыць на прыватнай кватэры і плаціць за яе немалыя грошы. Засялялі ў чатыры універсітэцкія інтэрнаты ў першую чаргу студэнтаў-сірот, са шматдзетных і малазабяспечаных сем"яў.

На сённяшні ж дзень маюцца яшчэ трыццаць пяць свабодных месцаў у інтэрнаце N4 (мікрараён Валатава). Іншагароднім студэнтам, якія жадаюць там пасяліцца, неабходна звярнуцца ў аддзел выхаваўчай работы з моладдзю (галоўны корпус, п.І-16, тэл.56-57-73).

## ЧЫНОЎНІК ДЛЯ ПРАВІНЦЫІ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 2-й стар.)

ных пачаткаў. Адсюль частае ігнараванне імі пытанняў сацыяльнага, псіхалагічнага, экалагічнага і нацыянальна-культурнага характару.

Намаганні вучоных і практыкаў неабходна накіраваць на распрацоўку рэспубліканскай канцэпцыі дзяржаўнай кадравай палітыкі і праграмы па яе рэалізацыі. Бо згодна Закону "Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце" у ім не маюць права займаць пасады асобы, прафесійная падрыхтоўка якіх не адпавядае кваліфікацыйным патрабаванням. Ці трэба гаварыць, якім вузкім з'яўляецца слой спецыялістаў, маючых такую падрыхтоўку. Наспела вострая патрэба ў рамках сістэмы адукацыі рэспублікі рыхтаваць кадры для органаў мясцовай улады і кіравання. Гэта пытанне прынцыповай важнасці, яно нацэлена на перспектыву. Па сутнасці справы, размова ідзе і аб падрыхтоўцы будучых палітыкаў, дзяржаўных дзеячоў. Мы дорага заплацілі, ды і плацім, за тое, што гэтаму пытанню ў нас не ўдзялялася належнай увагі. Ці многімі ўчарашнімі або сённяшнімі палітыкамі, дзяржаўнымі дзеячамі можа ганарыцца Беларусь?

Згодна Закону "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні" кадры павінны быць здольны арганізаваць на адпаведнай тэрыторыі работу па выкананню Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, указаў і распараджэнняў Прэзідэнта, рашэнняў вышэйстаячых выканаўчых і распарадчых інстытутаў. Органам мясцовай улады і кіравання патрэбны кадры, здольныя вырашаць самыя разнастайныя пытанні: працаўладкавання людзей, сацыяльна-культурнага, медыцынскага, гандлёвага, бытавога, транспартнага і іншага абслугоўвання насельніцтва. Гэта патрабуе прынцыпова іншага ўзроўню падрыхтоўкі кіруючага персаналу. Высокая агульная культура, валоданне навыкамі кіравання, веданне асноў псіхалогіі, права, паліталогіі, этыкі, сацыялогіі, добрае веданне хаця б адной замежнай мовы, камп'ютэрная граматнасць -- вось няпоўны пералік першачарговых патрабаванняў, якія павінны прад'яўляцца да сучаснага спецыяліста мясцовай адміністрацыі. Ён павінен арыентавацца ў сацыяльна-псіхалагічных сітуацыях, валодаць навыкамі вырашэння сацыяльных канфліктаў.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт ім. Ф.Скарыны гатовы ўзяць падрыхтоўку спецыялістаў мясцовага кіравання і самакіравання на сябе, што адпавядае профілю ГДУ, які і цяпер рыхтуе кадры для працы ў органах мясцовай улады і кіравання Гомельскай вобласці . Выкладчыкам нашай ВНУ, як нікому іншаму, вядомы праблемы правінцыі. Ды і самі студэнты знаёмы з імі не па чутках. Асноўны кантынгент іх з раёнаў Гомельшчыны.

Само геаграфічнае і тэрытарыяльнае размяшчэнне універсітэта як нельга лепей будзе садзейнічаць падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці "Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне".

**С.ЖАГОРАЎ,**
**ст. выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.**

## АДКРЫЎСЯ МАЛАДЗЁЖНЫ КЛУБ

Першае яго пасяджэнне адбылося на мінулым тыдні ў адной з аўдыторый І-га вучэбнага корпуса ГДУ. Цяпер жыццё студэнтаў стане больш насычаным і разнастайным. Плануецца праводзіць у клубе самыя розныя сустрэчы з цікавымі людзьмі, абмяркоўваць праблемы, якія хвалююць сёння і ўсё наша грамадства, і моладзь у прыватнасці. Невыпадковая і назва клуба -- "Светапогляд". Кожны студэнт можа стаць яго членам, прыходзіць на пасяджэнні, выказваць свае думкі па абмяркоўваемых пытаннях.

Першым госцем клуба стаў Шаміль Фатахаў -- журналіст з г.Казані, вядучы папулярнай у Татарстане і многіх рэгіёнах Расіі маладзёжнай тэлепраграмы "Зи По По" (заочный институт позитивного поведения). Псіхалагічная гульня, якую ён вядзе з аўдыторыяй, дапамагае яе ўдзельнікам знаходзіць правільнае выйсце з розных складаных сітуацый, якіх вельмі шмат у жыцці чалавека. Адну з такіх гульняў ён правёў са студэнтамі ГДУ. Тэмай яе стала такая актуальная для сённяшняга нашага грамадства загана, як п'янства. З дапамогай студэнтаў універсітэта ён інсцэніраваў адну з распаўсюджаных сярод моладзі сітуацый, звязаных са спіртным, і ... спыніў дзеянне на самым яго піку. Потым кожны ў аўдыторыі мог выказаць сваю думку адносна ўбачанага і прапанаваць далейшы ход падзей, а ў канчатковым выніку, падсумаваўшы ўсё сказанае, знайсці правільны выхад.

Гульня ўсіх зацікавіла, спадабалася.

Ш.Фатахаў прыехаў у Беларусь, каб правесці спецсемінары з псіхолагамі, усімі зацікаўленымі людзьмі з мэтай арганізацыі падобных гульняў у нашай рэспубліцы. Студэнт ГДУ Юрый Ільін, які абраны вядучым клуба, пасля вучобы на адным з такіх семінараў у г.Брэсце будзе праводзіць псіхалагічныя гульні з моладдзю універсітэта.

Казанскаму журналісту ўручана ганаровае пасведчанне клуба "Светапогляд" як першаму яго госцю.

Два разы ў месяц клуб будзе збіраць студэнтаў на свае пасяджэнні. Сачыце за рэкламай і прыходзьце. Не пашкадуеце.

Т.НІКАЛАЕВА.

## ПАНЕСЛІ СПАГНАННІ

23 жніўня г.г. у газеце "Советская Белоруссия" быў апублікаваны артыкул "Рэкет з вышэйшай адукацыяй". У ім расказвалася аб злачынных дзеяннях былых аспіранта кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін С.Скрабіна і студэнта біялагічнага факультэта А.Рунцо. Яны асуджаны Чыгуначным народным судом г.Гомеля адпаведна на 10 і 5 гадоў пазбаўлення волі.

Гэты артыкул быў абмеркаваны 26 верасня на пашыраным Савеце універсітэта. Загадам рэктара ад займаемых пасад вызвалены загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін дацэнт А.Ф.Карпенка і загадчыца аспірантуры Т.А.Скрынічэнка, дэкану біялагічнага факультэта дацэнту С.Ф.Алешку аб'яўлена вымова.

Як паведамлялася ў папярэднім нумары нашай газеты, на гэтым жа Савеце універсітэта былі абмеркаваны вынікі праверкі камісіі Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь па пастаноўцы навукова-даследчай работы ў ГДУ. За допушчаныя парушэнні загадам па універсітэту начальнік НДС Г.С.Міцюрыч вызвалены ад займаемай пасады, а прарэктару па навуковай рабоце прафесару А.М.Сердзюкову аб'яўлена вымова.

Прырода і мы

## ... ПРАЗ ЧАЛАВЕЧАЕ СЭРЦА

Нядаўна Беларуская рэспубліканская асацыяцыя "Зялёны клас" арганізавала і правяла на базе Гомельскага гарадскога Палаца піянераў і школьнікаў пасяджэнне "круглага стала" па праблеме "Экалогія і хрысціянства. Духоўнае здароўе грамадства і стан навакольнага прыроднага асяроддзя". У яго рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі дзяржаўных устаноў і грамадскіх экалагічных арганізацый, выкладчыкі ВНУ і настаўнікі, журналісты, а таксама дзеячы хрысціянскіх -- праваслаўнай, рымска-каталіцкай і пратэстанскіх цэркваў Беларусі. Прадчуванне ўсеагульнага экалагічнага крызісу, узрастаючая ў грамадстве адказнасць за захаванне жыцця на Зямлі прымушае ўсіх нас, веруючых і атэістаў, сумесна шукаць новыя падыходы да вырашэння сучасных экалагічных праблем, да пераадольвання маральнай і духоўнай дэградацыі грамадства, да выхавання чалавечнасці ў душы кожнага грамадзяніна. Асноўная задача "круглага стала" заключалася ў пошуку ўзаемаразумення і магчымасцей супрацоўніцтва рэлігійных і нерэлігійных арганізацый у справе экалагічнай адукацыі і выхавання моладзі.

У ходзе дыскусіі падкрэслівалася, што глыбінныя карані сучасных экалагічных праблем трэба шукаць не ў галіне навукова-тэхнічнага прагрэсу або матэрыяльнай вытворчасці, а ў сферы чалавечых каштоўнасцей і прыярытэтаў, у самой культуры сённяшняга грамадства. Менавіта таму паспяховае вырашэнне сучасных экалагічных праблем не можа абмяжоўвацца толькі ўдасканальваннем існуючых тэхналагічных працэсаў або прыняццем падобных мер матэрыяльнага характару, але патрабуе далучэння моладзі да вышэйшых агульначалавечых духоўных і этычных каштоўнасцей. На думку ўдзельнікаў "круглага стала", "шлях да рашэння сучасных экалагічных крызісаў праходзіць праз чалавечае сэрца."

"Круглы стол" не ставіў перад сабой задачу практычнага рашэння якіх-небудзь праблем і пытанняў. Аднак надзвычай каштоўным з'яўляецца тое, што ён выявіў агульную заклапочанасць за будучыню чалавека і навакольнага асяроддзя, прадэманстраваў гатоўнасць да супрацоўніцтва дзяржаўных структур, грамадскіх арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі і хрысціянскіх цэркваў у агульнай жыццёва важнай для ўсіх нас справе выхавання чалавечага ў чалавеку, у зберажэнні спрыяльнага для жыцця чалавека прыроднага асяроддзя, у захаванні самога Жыцця ў імя і на карысць Жыцця.

Відавочна, шлях да рашэння сучасных экалагічных праблем праходзіць праз чалавечае сэрца. Сэрца ж выхоўваецца толькі сэрцам. Шлях да самога сэрца ляжыць праз Храм яшчэ большага сэрца, праз Храм вышэйшай духоўнасці, вечнасці і спачування... .

Г.КАРОПА,
прэзідэнт Беларускай рэспубліканскай асацыяцыі "Зялёны клас", дацэнт кафедры геаграфіі.



Усміхніцеся!

## З ЖЫЦЦЯ ВЯЛІКІХ

Усім вядома, што вялікі французскі мысліцель Сен-Сімон прасіў з вечара свайго лакея будзіць яго кожную раніцу словамі: "Уставайце, граф! Вас чакаюць вялікія справы!" Аднак мала хто ведае, што адказам лакею раніцай была звычайна непрыстойная лаянка ды кінуты ў яго галаву чаравік.

***

Ці ведаеце вы, што першы варыянт казкі Шарля Перо "Чырвоная шапачка" заканчваўся тым, што Шэры Воўк з'ядаў дзяўчынку. І толькі асабістае ўмяшанне самога кардынала Рышэлье, які ўбачыў недвухсэнсоўны намёк на свой чырвоны галаўны ўбор, прымусіла аўтара падсаладзіць злую палітычную сатыру банальным "хэпі-эндам".

***

Вядома, што Сальеры так моцна мучыўся, не ведаючы, што падараваць Моцарту на дзень нараджэння, што атруціў яго перад гэтым.

***

Калі Напалеону далажылі, што генерал Маро пацярпеў чарговае паражэнне, ён заўважыў:

-- Гэты генерал, як барабан. Аб ім чуваць толькі тады, калі яго б'юць.

Лідэр

## "СЛЕЙД". ШОУ ПРАЦЯГАМ У 30 ГАДОЎ

Ёсць групы, якія нягледзячы на пастаянныя няўдачы і татальнае невязенне ў пачатку кар"еры, тым не менш не збочваюць з пачаткова абранага шляху. Дастаткова, напэўна, будзе нагадаць не зусім удалы дэбют груп "Квін", "Світ", "Сансон", калі даводзілася прабівацца скрозь неразуменне і неўспрынянцце, усяляк прываблiваючы публіку на свае шоу.

Амаль гэтак жа пачалася творчая біяграфія адной з самых самабытных груп Англіі -- групы "Слейд". Калектыў быў створаны ў 1966 годзе -- роўна 30 гадоў назад. У склад яе ўвайшлі вакаліст Нодзі Холдэр, гітарыст Дэйв Хіл, басіст Джымі Лі і барабаншчык Дон Пауэл. Пачалі яны выступаць у вядомым клубе "Распуцін" (ёсць у Лондане такі на Бонд-стрыт) у даволі маладым узросце -- удзельнікам праекта было 17-19 гадоў.

Самі таго не ведаючы, музыканты сталі прадвеснікамі панк-руху: магутныя гітарныя хардавыя хады, сіплы вакал, простыя вострасацыяльныя тэксты і, канешне ж, характэрная брудна-падкрэсленая манера спеваў. Усё гэта як мага больш адпавядала патрабаванням "музыкі рабочых раёнаў". Не дзіўна, што амаль тры гады група выступае толькі ў рабочых раёнах Лондана, а салідная рок-крытыка і рок-тусоўка не ўспрымае новую каманду. Паэзія таго, ды і больш позняга часу таксама, у групы "Слейд" будавалася на апісанні праблем гарадской ускраіны, са сленгавымі выразамі і жаргоннымі слоўцамі. На сцэне група з'яўлялася ў чорных скураных куртках і з брытымі галовамі, што шакіравала рэспектабельных рок-мэнаў.

Выпадкова на адно з такіх шоу трапіў Чэс Чэндлер -- былы менеджэр Джымі Хендрыкса. Ён убачыў тое, што адбывалася на сцэне, і хутка зразумеў: пры адпаведнай "раскрутцы" на гэтых хлопцах можна зарабіць кучу грошай. Ён прапанаваў ім кантракт.

За справу ўзяліся менеджэры, візажысты і прадзюсеры. Удзельнікі групы адрасцілі валасы, былі пераапрануты ў бліскучыя пінжакі і цыліндры, а ў музыцы арыенцір быў скіраваны ў бок жорсткага глітэр-рока з хардавымі каранямі. У 1974 годзе была запісана пласцінка "Іграй гучна", за якой з'яўляліся ўсё больш і больш тэндэнцыйныя альбомы, што выходзілі практычна штогод на радасць слухачам. Тыя атрымалі магчымасць слухаць тое, што было проста, цяжка па гуку і зразумела. Крытыкі абвінавачвалі групу ва ўсіх існуючых і неіснуючых грахах, а бізнесмены прадавалі дыскі дзесяткамі тысяч. Такія альбомы, як "Slayed, "Sladest", "Слейд у агні", "Nobody's Fools", "Вяртанне на базу" сталі не толькі класікай групы, але і класікай жанру.

Да пачатку 80-х гадоў папулярнасць "Слейд" пайшла на спад. Аднак дыск 1985 года "Галерэя жулікаў" вярнуў групе былую папулярнасць, паказаўшы, што пра "Слейд" забываць яшчэ рана. Пацвердзіў гэты тэзіс і дыск 1987 года з сімвалічнай назвай "Хлопцы, вы надта шуміце". Не менш скандальным стаў дыск "Гісторыя "Слейд", у якім група на якасна новым матэрыяле абыграла старыя клішэ і рок-стандарты "слейдаўскага" гучання эпохі росквіту ў сярэдзіне 70-х гадоў. Слухаецца гэты дыск па-новаму і ў той жа час з лёгкім налётам настальгіі па старых хітах.

Не так даўно група прыязджала ў Мінск, але без Холдэра. Тым, хто з'яўляецца прыхільнікам хард-рока і бесшабашнай весялосці, гучнага саўда і панібрацкага шоу, група "Слейд" без цяжкасцей створыць выдатны настрой.

П.БЕСЯЦКІ, вядучы рубрыкі "Лідэр".

*А нашым чытачам мы нагадваем, што аўтар прымае заяўкі ад студэнтаў, усіх прыхільнікаў айчыннай і замежнай музыкі на публікацыі матэрыялаў аб тых калектывах, спеваках, якія ім найбольш падабаюцца і з творчасцю якіх яны б хацелі пазнаёміцца больш падрабязна. Прапановы прымаюцца асабіста П.Бесяцкім, асістэнтам кафедры рускай літаратуры, або па тэл. 56-32-40.*

## МУДРАЕ СЛОВА

**Спадзяемся, што змешчаныя ніжэй вобразныя меркаванні, крылатыя выразы дапамогуць студэнцкай моладзі лепш разабрацца ў жыццёвых пытаннях, у выпрацоўцы творчых адносін да справы, маральных устояў, у выхаванні характару.**

• Наша жизнь -- путешествие, идея -- путеводитель. Нет путеводителя, и все останавливается. Цель утрачена, и сил как не бывало.

**В.ГЮГО.**

• Делай великое, не обещая великого.

**ПИФАГОР.**

• Как басня, так и жизнь ценится не за длину, но за содержание.

• Возненавидеть жизнь можно только вследствие апатии и лени.

**СЕНЕКА.**

• Хочешь быть умным, научись разумно спрашивать, внимательно слушать, спокойно отвечать и переставать говорить, когда нечего больше сказать.

**И.ЛАФАТЕР.**

• ... люди никогда не испытывают угрызений совести от поступков, ставших у них обычаем.

**ВОЛЬТЕР.**

• ...страх перед возможностью ошибки не должен отвращать нас от поисков истины.

**К.ГЕЛЬВЕЦИЙ.**

• Мужество делает ничтожными удары судьбы.

**ДЕМОКРИТ.**

• ... большое честолюбие издавна превращало много разумных людей в безумцев.

**И.КАНТ.**

• ... благодаря истинному знанию ты будешь гораздо смелее и совершеннее в каждой работе, нежели без него.

**А.ДЮРЕР.**

• Каждый день, в который вы не пополнили своего образования хотя бы маленьким, но новым для вас куском знания... считайте бесплодно и невозвратно для себя погибшим.

**С.СТАНИСЛАВСКИЙ.**

• Тщеславие есть не что иное, как несвоевременная попытка получить громкую известность прежде, чем мы заслужили ее ...

**А.СМИТ.**

• От мелких ошибок легко перейти к крупным порокам.

**СЕНЕКА.**

• Самая большая победа -- это победа над самим собой... Заставляй себя делать то, что надо, и должное станет для тебя желанным.

**В.А.СУХОМЛИНСКИЙ.**

• Каждый день следует ... прочесть хоть какое-нибудь мудрое изречение.

**И.ГЁТЕ.**

### ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства -- асістэнта;
-- беларускай мовы -- асістэнта;
-- англійскай мовы -- выкладчыка;
-- алгебры і геаметрыі -- дацэнта;
-- ВМ і праграміравання -- дацэнта;
-- геалогіі і разведкі карысных выкапняў -- дацэнта;
-- фізвыхавання -- старшага выкладчыка;
-- матэматычнага аналізу -- загадчыка кафедры;
-- заалогіі і аховы прыроды -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ**

## АЛЯШКЕВІЧ МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ

На 61-м годзе жыцця перастала біцца сэрца загадчыка кафедры фізічнай метралогіі, кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта, члена-карэспандэнта Акадэміі метралогіі Мікалая Іванавіча Аляшкевіча.



М.І.Аляшкевіч нарадзіўся ў 1936 годзе ў в.Крывасёлкі Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігодкі паступіў у вучылішча. У 1955г. быў прызваны ў рады Савецкай Арміі, па звальненні з яе ў запас працаваў у Маладзечанскім аблгандальупраўленні і завочна вучыўся ў школе рабочай моладзі. У 1959 г. паступіў на фізічны факультэт Беларускага дзяржуніверсітэта, пасля заканчэння якога быў пакінуты на кафедры фізічнай оптыкі і спектральнага аналізу на пасадзе стажора-даследчыка.

З 1965 г. М.І.Аляшкевіч пачынае працаваць у Гомельскім педагагічным інстытуце, а затым і ў Гомельскім універсітэце. Ён адзін з першых дэканаў фізічнага факультэта, нямала зрабіў у станаўленні і ўмацаванні факультэта і кафедр, вёў актыўную вучэбна-педагагічную і выхаваўчую работу. Ім чыталіся курсы агульнай фізікі: оптыка і ядзерная фізіка, атамная фізіка і інш. Пад яго кіраўніцтвам створаны вучэбныя лабараторыі: атамнай і малекулярнай спектраскапіі, люмінесцэнцыі, вакуумнай тэхнікі НПЛ "Фатоніка", студэнцкае канструктарскае тэхналагічнае бюро.

М.І.Аляшкевіч вёў вялікую навукова-даследчую работу. У 1986 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, ім апублікавана больш за 100 навуковых работ, стаў аўтарам звыш 30 вынаходніцтваў. Ён з'яўляўся кіраўніком навукова-даследчых і гаспдагаворных работ па пастанове Ўрада рэспублікі. Пад яго кіраўніцтвам абаронена 5 дысертацый.

М.І.Аляшкевіч карыстаўся заслужанай павагай і аўтарытэтам сярод выкладчыкаў і студэнтаў.

Светлая памяць аб М.І.Аляшкевічу назаўсёды захаваецца ў яго справах і пачынаннях ва універсітэце.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці загадчыка кафедры фізічнай метралогіі дацэнта **Аляшкевіча Мікалая Іванавіча** і выказваюць сваё спачуванне яго сям'і і родным.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ **521.**
Падпісана да друку 18.10.96.